**Литаратурнае чытанне, 2 клас.**

**Настаўніца: Агей Т.К.**

**Тэма: Казка “Пшанічны каласок”**

**Мэты**:мяркуецца, што будуць

**ведаць**: назву твора і яго аўтара;

аб казцы (падзеі, герояў, учынкі)

**умець**: арыентавацца ў змесце казкі па пытаннях настаўніка;

характарызаваць герояў казкі з погляду іх учынкаў;

выразна чытаць твор, перадаючы эмацыянальны стан герояў.

**Задачы асабістага развіцця:** садзейнічаць фарміраванню ў вучняў навыка правільнага, свядомага чытання;

спрыяць выхаванню працавітасці, асуджэнне гультайства; выхаванне беражлівых адносін да хлеба і людзей працы.

**Абсталяванне:** ілюстрацыі да казкі “Коцік, пеўнік і лісіца”, тэставае заданне, зярно пшаніцы, сноп, мука, хлеб, цэп для малацьбы, падручнікі, заданні для індывідуальнай работы.

**Ход урока**

1. ***Арганізацыйны момант***

***Псіхалагічны настрой***

Дзеці стаяць у крузе, узяўшыся за рукі, настаўнік чытае верш В.Віткі

*Добра,калі ты змалку*
*Можаш вітаць людзей.*
*Раніцай: -Добрага ранку!*
*І апоўдня: - Добры дзень!*
*Увечары пры сустрэчы*
*Знаёмым сказаць-Добры вечар!*
*І соннаму сонейку нанач,*
*І ўсім добрым людзям: - Дабранач!*

Я вітаю вас на ўроку літаратурнага чытання і жадаю вам добрага дня, каб вам сёння лёгка працавалася на ўроку. Усміхніцеся адзін аднаму, падарыце, хто каму пажадае, добрае цёплае слова, каб стала лягчэй і святлей на душы і ў нашых сэрцах. (Вучні шэпчуць словы адзін аднаму)

***2. Вызначэнне задач урока***

Зараз мы паспрабуем паставіць задачы на наш урок.Чым жа мы будзем займацца.

-Будзем правільна і выразна чытаць.

-Будзем думаць і разважаць

-Будзем адкрываць новае.

Кожная праца ацэньваецца. Вось і вы таксама будзеце ацэньваць сваю працу з дапамогай зярнятак. На зярнятках вы будзеце ставіць

\+ я малайчынка

? я стараюся

-не ўсё атрымліваецца

***3. Вызначэнне задач урока***

Які твор вы чыталі дома?

А хто яго аўтар?

Зараз я прапаную вам тэставую работу, каб праверыць як вы ведаеце казку “Коцік, пеўнік і лісічка”

**Тэст**

1\. Якога народа казка “Коцік, пеўнік і лісічка”

а) беларускага, б) украінскага, в) грузінскага.

2\. З кім жыў пеўнік?

а) з мышамі, б) з коцікам, в) з вожыкам.

3\. Чые гэта словы?

Коце, браце!

Мяне ліска нясе

У высокія горы,

У глыбокія норы.

а)коціка, б) лісы, в) пеўніка.

4\. Куды адправіўся коцік на паляванне ў трэці раз?

А) у далёкія лясы б)на рэчку в) на луг

5.Які музычны інструмент змайстраваў коцік?

а) баян, б) скрыпачку, в)гітару.

*Ключ для тэста*

1) А; 2) б; 3) в; 4) а; 5) б.

Ацаніце сваю працу.

***4. Моўная размінка***

Ла-ла-ла-казка зноў да нас прыйшла

Ды-ды-ды-казцы рады мы заўжды

Жы-жы-жы-казку сёння раскажы

Практыкаванне “Конік”

***5. Фізхвілінка для вачэй***

***6. Увядзенне ў тэму***

***Загадка***

Рос перш на волі ў полі.
Улетку цвіў і колас,
А калі абмалацілі
Ён у збожжа пераўтварыўся,
Са збожжа ў муку і цеста,
І у краме заняў месца (Хлеб)

Гутарка аб беражлівых адносінах да хлеба, людзей працы.

З каласка атрымоўваецца хлеб. Хлеб – гэта наша здароўе, наша сіла. Вы кожны дзень ясце хлеб, і ведаеце, напэўна, які доўгі шлях праходзіць ён, перш чым пападзе на наш стол.

На дошцы словы: *зярно, хлеб, мука, колас.*

**Гульня “Што спачатку, што пасля”**

Гэтыя словы звязаны з тэмай нашага ўрока, такое падарожжа зярнятка адбылося ў беларускай народнай казцы “Пшанічны каласок”.

***7. Слуханне казкі***

Я прапаную ўважліва паслухаць казку. Адзначыць простым алоўкам незразумелыя для вас словы.

*Слоўнікая работа*

Парабак – чалавек, якога нанімалі працаваць на пана або кулака.

Ток – месца, дзе абмалочвалі зерне са снапоў

Паветка – страха на слупах, прызначанае для хавання чаго –небудзь(сельскагаспадарчых прылад,дровы).

Дзежка –драўляная, крыху звужаная да верху пасудзіна(для захавання цеста, салення)

**Фізхвілінка**

*Раз-два-тры-чатыры-пяць,*
*Выйшаў коцік пагуляць.*
*А за ім браты-блізняткі,*
*Жыць не могуць без зарадкі.*

*Коцікі свавольнікі,*
*Як малыя школьнікі,*
*Скачуць, бегаюць, штурхаюцца*
*І пад стол хаваюцца.*
*Важна шпацыруюць,*
*Пакуль не пачуюць:*
*“Годзе, коцікі, гуляць,*
*Час над казкай працаваць!”*

***8. Праверка першаснага ўспрымання.***

Каму спадабалася казка? Хто з герояў казкі вам найбольш спадабаўся? Абгрунтуйце свой адказ.

-Якая гэта казка сумная, вясёлая ці мудрая? Да якой групы казак мы яе аднясём? (Пра жывёл)

Якія словы для вас яшчэ незразумелыя?

Цэп,млын(паказ наглядна і на малюнку)

***9.Работа з творам***

*А) Чытанне пачатку казкі*

-Як звалі герояў казкі?

-Чаму яны мелі такія імёны?

-Што запомнілася з жыцця курачкі?( Даглядала сваіх куранятак, грэблася на сметніку, шукала корм)

-Чым займаліся гусак і індык?

*Б) Працяг чытання казкі*

-Што знайшла курачка каля плота?

-Якую параду далі індык і гусак?

-Чаму яны адказаліся змалаціць колас?

*В) Заданне . Раскласці дзеянні курачкі ў пэўнай паслядоўнасці*

Змалаціла каласок

Намалола мукі

Рашчыніла цеста

Накалола дроў

Запаліла ў печы

Напякла булак

Ці лёгка было выконваць адной усю гэту работу курачцы?
За што выб хацелі пахваліць курачку?
Ацаніце сваю працу.

*Г) Чытанне твора ад слоў: Булкі пачаліся пячыся (самастойна)*
Ці пачаставала курачка індыка з гусаком булкамі? Чаму?
За што вы асуджаеце індыка і гусака?
Ці сорамна ім было?
А як  вы паступілі б на месцы курачкі?
Чаму вучыць нас гэта казка? (Быць працавітымі, умець дапамагаць адзін аднаму, цаніць сяброўства)

*Д) Падабраць прымаўку, якая найбольш падыходзіць да гэтай казкі.*
Размовамі сыты не будзеш.
Дрэнны абед, калі хлеба няма.
Вось на свеце як бывае: хто працуе, той і мае.
Хто працуе, той і святкуе.
Добра рабі, добра і будзе.

*Е) Складанне характарыстыкі герояў*
Падабраць словы, якія характарызуюць герояў казкі
Працавітая, клапатлівая, справядлівая, цярплівая, разумная
Гультаяваты, хітры, павольны, сварлівы, саветлівы
Ацаніце сваю працу.

*Ж) Экспрэс-апытванне*
-Каласок знайшлі гусак і індык. -
-Курачка працавала, а гусак і індык адпачывалі.+
- Гусак абмалаціў каласок. -
-Курачка аднесла зярняткі на млын.+
-Курачка важна шпацыравала па двары.-
-Булак напёк гусак. -
-Кураняткі частаваліся свежымі пшанічнымі булкамі.+
Узаемаправерка. Ацаніце сваю працу.

***10. Вынік урока***

- З якім творам мы пазнаёміліся?

- Ці лёгка вырасціць хлеб?
- Як трэба адносіцца да хлеба?

Паглядзіце на вашы зярняткі. Якіх зярнятак у вас больш? Пастаўце такі знак на вялікім зярнятку і прымацуйце яго да дошкі?

***11. Дамашнее заданне***

Навучыцца расказваць казку. Прыдумаць працяг казкі або намаляваць ілюстрацыю .